**Сутула, Г.** Дарогамі Афганістана ў бяссонні блукае душа… / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. — 2013. — 20 лістап. — С. 4.

# ДАРОГАМІ АФГАНІСТАНА Ў БЯССОННІ БЛУКАЕ ДУША…

**25 снежня 1979 года савецкія войскі перасеклі мяжу Афганістана. Першай баявой аперацыяй, што праходзіла на чужой тэрыторыі пад кодавай назвай «Шторм-333» 27 снежня, стаў захоп палаца Тадж-Бек тагачаснага кіраўніка краіны Хафізуллы Аміна ў Кабуле.**

**25 снежня 1979 – 15 лютага 1989 года… Гэта так мала для жыцця і так многа для смерці, якая 3 тысячы 705 дзён і начэй выходзіла на крывавае жніво. Колькасць забітых з кожным годам павялічвалася: у 1979-ым загінулі 86 чалавек, у 1982-ім – 1 тысяча 948, у 1984-ым – 2 тысячы 343 салдаты…. Праз гарніла афганскай вайны прайшлі больш за 300 тысяч беларускіх юнакоў, 887 – вярнуліся дадому рэйсамі «чорнага цюльпана» і навечна засталіся ў памяці «цынкавымі хлопчыкамі». Каля тысячы салдат сталі інвалідамі, амаль столькі ж памерлі ад ран і хвароб у пасляваенны час. Пасля дзесяці гадоў афганскай бойні дамоў, у розныя куточкі Савецкага Саюза, не вярнуліся больш за 15 тысяч 50 ваеннаслужачых. Сярод загінуўшых за свабоду сваёй краіны 1 мільён афганцаў, столькі ж – параненых і кантужаных.**

Без документов, без имён, без наций
Лежим вокруг сожженного дворца.
Горит звезда, пора навек прощаться,
Разлука тоже будет без конца…

**Вясковыя паралелі**



**Генадзь Маршалаў у Афганістане.**



**Генадзь Леанідавіч з жонкай Галінай і дачкой Марынай**

*Жыццё ідзе.*
*У ім магчымы*
*Нязвыклы паварот падзей…*

Дзяцінства і юнацтва Гены Маршалава прайшло ў вёсцы Дзяцель у Дубровенскім раёне. Разам са старэйшым братам Сашам і дзвюма сястрычкамі хлопчык ахвотна дапамагаў бацькам. Працоўную стажыроўку праходзіў на пасьбе і ў агародзе, на сенажаці і ў кабіне бацькавага аўтамабіля, за руль якога ён так марыў сесці. Ажыццявіць мару дапамагло накіраванне ваенкамата. Спецыяльнасць вадзіцеля Гена атрымаў у Аршанскай аўташколе. Але пакалясіць дарогамі малой радзімы, возячы збажыну ці сена, яму не давялося: у 1983-ім прыйшла павестка ў армію. На камісіі даведаўся, што фарміруецца спецыяльны абмежаваны кантынгент войск для вядзення баявых дзеянняў на чужой тэрыторыі. «Вучэбку» Генадзь Маршалаў праходзіў у Казахстане, затым з Усць-Каменагорска на самалёце быў перапраўлены ў Кабул. Жыццё выпісала Генадзю пуцявы ліст у «гарачую кропку», зрабіўшы навабранца і яго равеснікаў галоўнымі героямі савецкаафганскага баевіка. Вось толькі ў адрозненне ад экраннага фільма два гады тэрміновай службы, душманы, артабстрэлы і «свінцовыя дажджы» былі не бутафорыяй, а горкай і балючай рэальнасцю.

***

Галя Піскуновіч з вёскі Абруб, што на Глыбоччыне, была самай малодшай у сям’і, у якой выхоўваліся восем дзяцей. Маміна памочніца ўмела рабіць усё: палола градкі, даіла карову, збірала траву свінням і карміла іх, прыбірала і гатавала. Вучылася ў Кіраўскай школе, хацела стаць бухгалтарам. Атрымаўшы атэстат, паступіла ў Полацкі сельскагаспадарчы тэхнікум. У яе дзявочым жыцці на той час было не толькі студэнцтва, але і каханне. Чатыры гады яна сябравала з хлопцам, за якога, хутчэй за ўсё, збіралася замуж.

**Беларускі «след» у афганскіх пясках**

180-ы мотастралковы полк, у які трапіў Генадзь, знаходзіўся ў некалькіх кіламетрах ад палаца Аміна ля Кабула. Радавы Маршалаў трапіў ва ўзвод забеспячэння, атрымаў ЗІЛ-130 і ўсе два гады падвозіў зброю, боепрыпасы, медыкаменты, прадукты харчавання.

– Чужая краіна сустрэла нас варожа: з першых дзён мы зразумелі, што нас тут не чакалі і нам не рады. Страшна было пасля першых артабстрэлаў, затым прывыклі. Ахоўвалі перавал Саланг, дарогу, што вяла ў Кабул, падземны тунэль, пракладзены ў скале, па якім перапраўлялася з Саюза тэхніка і жывая сіла. Пастаянна былі ў стане баявой гатоўнасці, але салдаты гінулі і ў час правядзення спецаперацый, і ў час нечаканых налётаў. Душманы пад зямлёй, як краты, нарылі хадоў і ў любым месцы выскаквалі з кірызаў (пясчаных ям), стралялі з гранатамётаў і зноў знікалі ў падзямеллях – паспрабуй, выкуры іх адтуль… Час на вайне бег хутка, бо мы былі пастаянна занятыя. Хадзілі ў дазор, дзяжурылі, капалі акопы, рамантавалі тэхніку, бо ад яе спраўнасці залежала наша бяспека і жыццё, – так пачаў сваю аповесць пра далёкую вайну вадзіцель філіяла «Каралі» ААТ «Глыбоцкі мясакамбінат» Генадзь Маршалаў. – Выпрабоўвалі нас у Афганістане не толькі душманы, але і надвор’е. Летам скалы награваліся так, што ні стаяць, ні сядзець неяк было, а ночы – халодныя. Усе два гады жылі ў палатках. Зімой тэмпература -10 градусаў, вільготна, сыра. Каб сагрэцца, цяплілі дзве печкі-«буржуйкі». За два гады так і не прывык я да голых скал і пясчаных пустэльняў. Вока, прызвычаенае да беларускіх краявідаў, родных пейзажаў у Афганістане не знаходзіла…

*Серебрится Млечный путь*
*новою звездою.*
*Не окликнуть, не вернуть*
*друга после боя.*
*Перекрещены пути*
*Огненный и Млечный.*
*Ни один не обойти*
*на дороге вечной…*

Гэтыя словы Віктара Верстакова, аўтара зборніка вершаў «Палае горад Кандагар», здаецца, пра Генадзя і яго сябра.

– У суседнім батальёне служыў мой зямляк Анатоль, а ва ўзводзе я пазнаёміўся з украінцам Ігарам, з якім мы сталі добрымі сябрамі. Ён быў санінструктарам, хадзіў з хлопцам і на кожнае заданне, аказваў першую медыцынскую дапамогу параненым. Па інструкцыі ён заўсёды «замыкаў» калону: на вайне медыкаў берагглі, – расказвае Генадзь Леанідавіч. – Аднойчы здарылася непапраўнае: салдат-навічок не заўважыў міну-расцяжку, на якой і падарваліся некалькі чалавек. Я бачыў пасечаны асколкамі аўтамат сябра. Такім жа знявечаным было і цела Ігара. Ніхто не меў там страхоўкі ад кулі і смерці.

Генадзю пашчасціла: ён ні разу не быў паранены, але быў момант, што яго жыццё вісела на валаску ад смерці. Гэта здарылася, калі ў батальёне лютаваў брушны тыф.

– На дварэ – больш за плюс сорак, у мяне тэмпература амаль сорак. Адчуванне такое, што гару, скура трэскаецца. Свядомасць расплываецца, нічога не ўспрымаю і нічога не разумею. Медыкаментаў для лячэння тыфу ў батальёне не было. Каб хоць неяк збіць тэмпературу, хлопцы раніцой неслі мяне на рэчку і клалі ў сцюдзёную праточную ваду. Тым і ратаваўся. Затым на верталёце мяне пераправілі ў шпіталь горада Баграма. Там кропельніцы, уколы – урачы выратавалі, вярнуўся ў свой узвод і працягваў службу, – мой субяседнік з болем дастае з памяці горкія ўспаміны.

Генадзь ні разу не напісаў дадому, як нялёгка яму прыходзіцца ў Афганістане. І хоць камандзіры загадвалі, каб салдаты пісалі родным, за ўсе два гады ён толькі лістоў дзесяць і паслаў маці палявой поштай. «У мяне ўсё добра. Служу. Хутка вярнуся. Як вы там жывы здаровы?» – скупыя словы ў сціслых скупых радках, за якімі былі схаваны боль развітання з радзімай і з бацькамі, і надзея на тое, што ў бацькоўскую хату вернецца жывым.

20 мая 1985 года. Дэмабілізаваўшыся, Генадзь Маршалаў больш за тыдзень дабіраўся дадому.

– Гэта туды нас даставілі арганізавана, а назад – дабірайся, як хочаш. Каму ўдалося, той вылецеў на верталёце з грузавым рэйсам, а я пяць сутак ехаў цягніком спачатку да Ташкента, затым – да Масквы, пасля – да Оршы. Добра, што былі чэкі, якія нам давалі ў Афганістане і за якія мы ў ваенным магазіне куплялі неабходнае. Прыехаўшы
ў Оршу, я ўсе чэкі, што былі, аддаў таксісту, каб толькі хутчэй той завёз мяне дадому.

**Пад зорным небам Беларусі**

*Душа, асветленая промнем*
*Яе глыбіннае красы,*
*Не стоміцца заўсёды помніць,*
*Адкуль пайшоў і чый я сын.*

Кожны дзень пасля работы, мама Генадзя, Ганна Пятроўна, ішла па пошту. Радавалася, калі прыходзіла пісьмо ад сына, радавалася ўдвая, калі пісьма не было: галоўнае, што яе не чакала пахавальная.

Галя Піскуновіч заканчвала вучобу ў Полацкім сельгастэхнікуме. На пераддыпломную практыку яе адправілі ў Дубровенскі раён, на радзіму Генадзя. Аднойчы раніцай, убачыўшы дзяўчыну, Ганна Пятроўна, падзялілася з ёй сваёй радасцю: «Дачушка мая, мой сынок з арміі вярнуўся». Як у ваду глядзела мудрая жанчына: праз нейкі час «дачушка» стала яе нявесткай.

– Нібы токам цела маё працяло, як яго ўбачыла і адразу падумала: «Мой гэта чалавек», – далучаецца да размовы жонка Генадзя Леанідавіча Галіна Іванаўна. – Праз год знаёмства мы на Генавым ГАЗ-53 паехалі ў ЗАГС заяву падаваць, а 20 верасня 1986 года ажаніліся. Я мужа перацягнула на сваю радзіму, у Абруб: з 1988 года тут і жывём. Калгас нам хату даў, якую мы ўдваіх, лічы, наноў пабудавалі і прыватызавалі. Усё з ім удваіх рабілі. Гаспадарку вялікую мелі, зямлю. Дзяцей дваіх, Марынку і Ігара, нарадзілі, на ногі паставілі, вучылі. Усе дваццаць сем гадоў сумеснага жыцця я была шчаслівая тым, што маю такога мужа.

Генадзь Леанідавіч, як воін-інтэрнацыяналіст, мог карыстацца льготамі, але ні разу ў жыцці ён нікога ні аб чым не папрасіў, бо лічыў, што маючы рукі-ногі, усяго ў жыцці можна дабіцца самому. Кожны год 15 лютага сям'я Маршалавых садзіцца за стол, каб адзначыць і дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, і другі дзень нараджэння Генадзя, які вярнуўся з той вайны, каб пачаць жыццё з чыстага ліста. Нешматслоўны гаспадар, якому да цяперашняга баліць душа ад перажытага, тым не менш перанёс тую прастрэленую памяць у дзень сённяшні: назваў сына іменем сябра Ігара, які падарваўся на афганскай міне.

– Вайна была суровай школай, але яна многаму мяне, «зялёнага» юнца, навучыла: мужчынскаму братэрству; цярплівасці і вынослівасці; дапамагла набыць універсальныя навыкі – аднолькава добра страляць, тэхніку рамантаваць, гатаваць, шыць; уменню выжываць у любых умовах; не разменьвацца на дробязі, а цаніць жыццё, якое і ёсць самы каштоўны дар, – кажа Генадзь Леанідавіч.

Гэтыя словы ён ніколі не гаварыў сваім дзецям, а выхоўваў іх толькі на ўласным прыкладзе. Гэтыя словы ён, магчыма, скажа вучням Кіраўскай школы ў дзень чарговай сустрэчы з нагоды 25-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана, падзеі, якая для яго з'яўляецца гісторыяй і памяццю.

**Галіна Сутула**

**Фота Алены Менжынскай**